# ПОСПЕХІ МЕЛІЯРАТАРАЎ

Некалі ў Доўгім і навакольных вёсках праклінalі балоты. Іх баяўся чалавек. Спрадвечная дрыгва хавала ад людзей свае скарбы. І вось «ступіў тут бальшавік», як пісаў некалі Янка Купала, і «змяніў гэты край». Больш людзі не праклінаюць балоты. Цяпер аб іх песні співаюць.

Змяніла свой воблік і Доўгае. На ўскраіне — цэлы пасёлак меліяратараў. Тут жывуць і працуюць людзі, якія павялі і працягваюць наступленне на дрыгву. Радуе вока роўная вуліца, абсаджаная маладымі дрэўцамі. Абапал яе — жылыя і адміністрацыйныя будынкі. Тут клуб, сталовая, два магазіны. Пройдзе нямнога часу, і ў строй уступіць новая сталовая. Будуецца бальніца, асфальтуецца цэнтральная вуліца. Толькі за гэты месяц пабудавана 115 квадратных метраў жылля.

Сёння рабочыя і служачыя нашага будаўнічага ўпраўлення жывуць у добраўпарадкаваных кватэрах. Недалёка той час, калі ў адміністрацыйныя і жылыя будынкі будзе праведзена паравое ацяпленне. Будаўніцтва цэнтральнай кацельнай ужо пачалося.

Усё гэта, вядома, радуе кожнага. Людзі бачаць вялікія перамены і стараюцца працаваць як лепш. На ўсіх участках з наступленнем вясны разгарнуліся работы. Трэба сказаць, што ў спаборніцтве за выкананне ўзятых у гонар юбілею рэспублікі абавязацельстваў тон задаюць камуністы. А на іх раўняюцца беспартыйныя.

На балотах саўгаса «Зара» у разгары асушальныя работы. Тут працуе сем экскаватараў. Найбольшай жа выпрацоўкі дабіўся экіпаж камуністаў Уладзіміра і Паўла Даўматовічаў. Не буду называць кубаметры вынятага імі грунта. Скажу толькі, што план першага квартала камуністы выканалі на 247 працэнтаў. Лічба, як бачыце, гаворыць сама за сябе.

Добра працуе аплётчыкам камуніст Міхаіл Качур. Высокія паказчыкі за першы квартал і ў трактарыста кандыдата ў члены партыі т. Банасевіча. Пералік перадавікоў спаборніцтва можна было б працягваць. Хачу пры гэтым падкрэсліць, што ў людзей высокі настрой працаваць. Вось чаму план першага квартала калектыў нашага ўпраўлення выканаў на 137 працэнтаў. Калгасы і саўгасы нашага і суседніх раёнаў атрымаюць сёлета сотні гектараў асушаных зямель, расшыраць свае пасяўныя плошчы.

За высокія паказчыкі ў рабоце за першы квартал калектыву нашага ўпраўлення прысуджан пераходны Чырвоны сцяг галоўнага ўпраўлення па асушэнню зямель і будаўніцтву саўгасаў Палесся пры Міністэрстве меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР і Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюзаў з адначасовай выдачай прэміі ў суме 4.200 рублёў.

**А. ШАЎЦОЎ,**

сакратар партыйнай арганізацыі Старобінскага БМУ.